**Сыцько К.В.**

# ВЫЯЎЛЕНЧЫЯ МАТЭРЫЯЛЫ ПАРАФІЯЛЬНЫХ АРХІВАЎ РЫМСКА-КАТАЛІЦКАГА КАСЦЁЛА Ў БЕЛАРУСІ ЯК ГІСТАРЫЧНАЯ КРЫНІЦА

У архівах парафій Рымска-каталіцкага Касцёла ў Беларусі назапасіўся вялікі масіў дакументаў XVII–XX стст., датычных мікрагістарычных і паўсядзённых аспектаў існавання культа. Збольшага памянёныя матэрыялы прадстаўлены ў тэкставым выглядзе, у невялікай долі прысутнічаюць канвенцыйныя і выяўленчыя (візуальныя) крыніцы. У дадзеным артыкуле аўтар характарызуе візуальныя дакументы, выяўленыя ім у парафіяльных архівах падчас палявых археаграфічных экспедыцый. Частка памянёных матэрыялаў перададзена ў Цэнтральны навуковы архіў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі ў выглядзе фотакопій і скан-копій.

Інфармацыйны асяродак культа, апроч вуснага напаўнення (літургій і гамілій) і пісьмовай фіксацыі сакрамэнта (ў выглядзе дакумента), уключае ў сябе візуалізацыю, прадстаўленую абразамі, скульптурамі, крыжамі. У сваю чаргу, у артыкуле характарызуюцца толькі архіўныя выяўленчыя матэрыялы, адпаведна візуальнае атачэнне касцёлаў прааналізаваным не будзе. Разгляданыя гістарычныя крыніцы парафіяльных установаў можна падзяліць на тры групы – выяўленча-графічныя, выяўленча-натуральныя, выяўленча-мастацкія, што адпавядае класіфікацыйным схемам С. О. Шмідта [12, с. 87]. Асаблівасцю большай часткі знойдзеных і апісаных падчас экспедыцый візуальных матэрыялаў з’яўляецца наяўнасць звестак аб іх тэрытарыяльным, персанальным і часавым кантэксце, то бок атрыбуцыя падзей іх назіральнікамі ці ўдзельнікамі, якімі з’яўляюцца мясцовыя ксяндзы, архітэктары праэктаў сакральных будынкаў і інш.

У колькасных суадносінах найлепш прадстаўлены выяўленча-графічныя матэрыялы касцёлаў (мапы, схемы і планы), якія даюць магчымасць аналізу зменаў у памерах парафіяльных зямельных надзелаў. Так, захаваныя мапы бенефіцыі Шчучынскага касцёла Святой Тэрэзы Авільскай за 1719 і 1893 гг., захаваныя ў копіях, зробленых кс. Янам Курчэўскім [2, арк. 199, 230], даюць магчымасць казаць аб значным змяншэнні парафіяльнай зямельнай маёмасці напрыканцы XIX ст. Апроч гэтага, на памянёных мапах назіраецца рост горада – з’яўленне новых дамоў на плошчы паміж касцёлам і могілкамі, змяненне тракта Гродна – Васілішкі, які ў 1719 г. праходзіў праз могілкі, а ў 1893 г. аказаўся вынесеным за касцельны надзел.

Аналагічныя мапы з адлюстраваннем уласнасці культа захаваліся ў Слабадской, Ішчальнскай і іншых парафіях. Пры гэтым у выпадку са схемай зямельнай маёмасці парафіі Найсвяцейшай Тройцы ў в. Ішчална прагледжваецца палітыка ўрада Расійскай імперыі ў дачыненні да Рымска-каталіцкага Касцёла пасля паўстання 1863–1864 гг. У прыватнасці, настаяцель Дзікушскай праваслаўнай царквы Віктар Плаўскі ў 1800 г. запатрабаваў канфіскаваць у парафіі адну дзесяціну і 1600 сажняў зямлі, якія нібыта належалі праваслаўнай канфесіі і былі гвалтам атабранымі рыма-каталікамі напрыканцы XVIII ст. У якасці доказу невінаватасці ішчальнскі плебан кс. Эдвард Свяцкевіч прадставіў захаваную ў касцельным архіве мапу парафіяльных земляў і дакументы аб дабравольным фундаванні гэтых земляў мясцовай шляхтай на карысць касцёла ў XVII–XVIII стст. Судом прадстаўлены матэрыял не быў прыняты за доказ і спрэчны кавалак тэрыторыі адышоў да Дзікушскага прыхода [1, арк. 24–24адв.].

Цікавым матэрыялам, які пралівае святло на тэндэнцыі лацінскага культа па будоўлі, з’яўляюцца шматлікія захаваныя планы культавых будынкаў. Падобныя крыніцы даюць магчымасць аналізу развіцця культавага дойлідства і нясуць каштоўную інфармацыю аб развіцці архітэктуры невялікіх населеных пунктаў. У тым ліку праліваецца святло на нездзейсненыя праэкты. Напрыклад, у 1865 г. Ішкалдскі Святатраецкі касцёл быў канфіскаваны на карысць праваслаўных. Каталіцкія вернікі маліліся ў драўлянай прыбудове і, пачынаючы ад 1880 г., патрабавалі ва ўладаў права на пабудову новай святыні. У 1911 г. патрабаванні былі адобраны, створаны праэкт нэагатычнага трохнефнага храма з камяню, які так і не рэалізаваўся па прычыне пачатка Першай сусветнай вайны [10, арк. 31].

Перыяду II Рэчы Паспалітай уласціва драбленне парафіяльнай сеткі шляхам падзелу старых, вялікіх па памерах парафій, на две часткі. Для абслугоўвання духоўных патрэб вернікаў новаўтвораных парафій былі развернуты актыўныя працы па пабудове новых касцёлаў. Вялікую колькасць з іх не ўдалося скончыць з-за пачатка Другой сусветнай вайны. Напрыклад,



Репозиторий ВГУ

захаваліся планы канца 1930-х гг. пабудовы Гарадзейскага, Валдацішскага і інш. нездзейсненых праэктаў касцёлаў. Варта заўважыць, што шэраг праэктаў удалося завяршыць да 1939 г. Так, захаваныя ў Лідскай Фары планы капліцы Святой Барбары сведчаць, што першапачаткова планавалася здзейсніць драўляны будынак, які распалагаўся б роўна ў цэнтры парафіяльных могілак [5, арк. 1]. У выніку, дзякуючы фундатарам, капліцу пабудавалі ў 1930-я гг. з бутавага камення, яе распалажэнне было зменена і яна стала ля самага ўваходу на тэрыторыю пахаванняў. У ліку здзейсненых праэктаў можна назваць перапланіроўку пашкоджанага выбуховым прыстасаваннем у 1915 г. Ляцкага касцёла, а таксама планы прыбудовы новай вежы ў Селіванаўскім касцёле [7, арк. 1–8]. Аб здзяйсненні гэтых прац сведчыць сучасны выгляд культавых будынкаў, адпавядаючы таму, што зафіксавана на паперы ў 1930-я гг.

Выяўленча-натуральныя матэрыялы, прадстаўленыя фотаздымкамі, захаваліся ў парафіяльных архівах значна горш за выяўленча-графічныя. На сённяшні момант можна казаць аб некалькіх дзесятках адзінак захавання, датаваных 1905–1950 гг. Асаблівасцю калекцый фотавыяў усіх касцёлаў з’яўляецца тое, што на абаротным баку дадзена апісанне выявы. Дзякуючы гэтым крыніцам стала магчымым устанавіць знешні выгляд некаторых святароў, напрыклад – закатаванага ў 1943 г. фашыстамі пробашча Альфонса Бароўскага, а таксама ганаровага каноніка Юзэфа Шкопа [9, арк. 1]. Захаваўся шэраг фотаздымкаў, прысвечаных сходам моладзевых каталіцкіх акцый, харцараў, міністранцкага руху і інш., што дазваляе аналізаваць уключанасць моладзі ў дзейнасць разнастайных рэлігійных і цывільных арганізацый. Напрыклад, у Ляцкай парафіі па стане на 1930-я гг., паводле паіменных спісаў каталіцкіх вернікаў, налічвалася 2896 асоб. З іх моладзь, якая адпавядала патрабаванням малодшых харцараў-зухаў (узрост ад 7 да 11 год) – каля 200 чалавек. На фотаздымках мясцовай супольнасці руху, датаваных 1933 г., прадстаўлены 97 сяброў арганізацыі (49% ад агульнай колькасці жыхароў Ляцкай парафіі названай узроставай катэгорыі) [9, арк. 3]. Падобныя суадносіны гавораць аб актыўным правядзенні касцёлам і польскім урадам палітыкі прапольскага выхавання дзяцей і моладзі ў Заходняй Беларусі.

Суаднясенне фотавыяў падзей з мікрагістарычнымі наратывамі, датычнымі жыцця парафіі, даюць магчымасць верыфікацыі апісаных у тэкстах зрэзаў гістарычнай рэальнасці. Напрыклад, кс. Казімір-Генрык Васілеўскі ў хроніцы парафіі Святой Марыі Магдалены ў Валдацішках, напісанай у 1938–1940 гг., адзначаў, што прыезд арцыбіскупа Рамуальда Ялбжыкоўскага 9 траўня 1939 г. стварыў вялікія натоўпы, якія спявалі рэлігійныя песні, а па ад’ездзе Ялбжыкоўскага абступілі яго машыну і не хацелі адпускаць. Захаваныя фотаздымкі сапраўды сведчаць аб прысутнасці на ўрачыстасці вялікай колькасці асоб, а таксама аб тым, што натоўп атачаў арцыбіскупа, аўтамабіль якога апынуўся ў самым цэнтры навалы людзей [11, арк. 28–32].

Шэраг міжваенных фотаздымкаў дазваляе аналізаваць стан скульптур і крыжоў, якія лічыліся цудадзейнымі, а таксама чын іх пачытання. Напрыклад, у кнізе цудаў фігуры Езуса Журботнага ў Росі, пачынаючы з XVIII ст. апісваліся парадкі ўскладання воты ў адмысловы яшчык, а таксама сама фігура. Фотаздымкі канца 1920-ых гг., а таксама прысутнасць аўтара падчас археаграфічнай экспедыцыі на набажэстве ў Росскім Святатраецкім касцёле ў 2018 г., дазваляюць казаць, што чын пакланення фігуры, апісаны ў 1745 г. Шыманам Масарскім, дайшоў да міжваеннага перыяду ў нязменным выглядзе, а затым аднавіўся ў наш час, аднак воты былі заменены на іншыя віды ахвяры. Знешні выгляд скульптуры таксама не пацярпеў змен [6, арк. 17]. Яшчэ адным прыкладам з’яўляецца цудадзейны крыж у Цвермах, пачытанне якога адлічваецца ад 1710 г. Падчас Савецка-Польскай вайны 1919–1921 гг. крыж быў зламаны вандаламі. У 1932 г. доктар з Лідскага павету Марыя Вісмант зрабіла фотаздымкі, якія дазваляюць устанавіць характар пашкоджанняў – адбітыя рукі і ногі фігуры Езуса і глыбокія расколіны па гарызантальнай і вертыкальнай бэльках [4, арк. 2]. На сённяшні дзень рэліквія знаходзіцца ў тым жа стане, у якім была выяўлена на фота.

Выяўленча-мастацкія крыніцы, да якіх адносяцца карціны, малюнкі, эстампы, з’яўляюцца самымі малаколькаснымі візуальнымі дакументамі, прадстаўленымі ў парафіяльных архівах Рымска-каталіцкага Касцёла ў Беларусі. У большасці выпадкаў дадзеныя матэрыялы ўяўляюць сабой агульнавядомыя сімвалы і выкарыстоўваюцца ў якасці мастацкага аздаблення тэкстаў. Напрыклад, у справе са статутам і спісам сяброў 1800 г. кангрэгацыі Найсвяцейшага Сэрца Езуса ў Шчучыне быў выяўлены шэраг асобных аркушаў з ветхазаветнымі сімваламі – сэрца ў цярновым вянцы, а

таксама голуба, які сімвалізуе Святы Дух [3, арк. 2адв.]. Падобныя малюнкі сустракаюцца ў вялікай колькасці касцёлаў, у якіх захаваліся дакументы аб брацтвах і кангрэгацыях.

Цікавай выяўленча-мастацкай крыніцай з'яўляюцца акварэльныя малюнкі архітэктара Яна Бароўскага, запрошанага ў 1937 г. праэктаваць парафіяльны касцёл у Гарадзеі. Дадзеныя матэрыялы былі выяўлены сярод дакументазбору Паланэчскага касцёла, куды трапілі ў 1940 г. разам з іншымі матэрыяламі зачыненай гарадзейскай парафіі. Атрыбутаваць аўтара дазволіў крыптонім "J. B.", а таксама почырк подпісаў пад малюнкамі, які супадаў з почыркам Я. Бароўскага. Архітэктар не толькі намаляваў некалькі планаў храма, але і паказаў, якім бачыць яго знешні і ўнутранны выгляд пасля здачы ў эксплуатацыю [8, арк. 1–2]. Касцёл у выніку не быў пабудаваны, вернікі на сённяшні момант карыстаюцца былой парафіяльнай капліцай, якая з'явілася ў 1924 г. і пазней атрымала статус касцёла. Наяўнасць падобных малюнкаў паказвае перспектыўныя планы і ідэі, адлюстроўвае недахоп касцёлаў на душу насельніцтва ў міжваеннай Польшчы – невялікая па памерах Гарадзея, у якой пабудавалі капліцу, мела настолькі вялікую колькасць вернікаў лацінскага абрада, што праз 13 год пасля ўзвядзення будынка запатрабаваўся новы, больш вялікі па памерах.

Такім чынам, выяўленчыя дакументы парафіяльных архіваў Рымска-каталіцкага Касцёла ў Беларусі прадстаўлены мапамі касцельных зямельных надзелаў; схемамі, планамі будынкаў; фотаздымкамі; малюнкамі. Дадзеныя гістарычныя крыніцы раскрываюць аспекты гісторыі культавага будаўніцтва ў асобных населеных пунктах, змен парафіяльнай тэрыторыі, дзейнасці рэлігійных і цывільных арганізацый у невялікіх лакацыях. З дапамогай візуальных дакументаў становіцца магчымым аналізаваць знешні выгляд і стан фігур і крыжоў, якія лічыліся цудадзейнымі, аднаўляць знешні выгляд міжваенных парафіяльных святароў. Выяўленчыя крыніцы значна дапаўняюць інфармацыйнае поле тэкставых матэрыялаў, што гаворыць аб іх важнасці ў даследаванні мікрагісторыі і гісторыі штодзённасці Рымска-каталіцкага Касцёла ў Беларусі.


1. Цэнтральны навуковы архіў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі (далей – ЦНА НАН Беларусі). – Ф. 3С. Воп. 2. Спр. 42.
2. ЦНА НАН Беларусі. – Ф. 3С. Воп. 3. Спр. 1.
3. ЦНА НАН Беларусі. – Ф. 3С. Воп. 3. Спр. 5.
4. ЦНА НАН Беларусі. – Ф. 3С. Воп. 4. Спр. 11.
5. ЦНА НАН Беларусі. – Ф. 3С. Воп. 4. Спр. 13.
6. ЦНА НАН Беларусі. – Ф. 3С. Воп. 5. Спр. 4.
7. ЦНА НАН Беларусі. – Ф. 3С. Воп. 11. Спр. 17.
8. ЦНА НАН Беларусі. – Ф. 3С. Воп. 13. Спр. 1.
9. ЦНА НАН Беларусі. – Ф. 3С. Воп. 15. Спр. 3.
10. ЦНА НАН Беларусі. – Ф. 3С. Воп. 18. Спр. 24.
11. ЦНА НАН Беларусі. – Ф. 3С. Воп. 25. – Спр. 1.
12. Шмидт, С. О. Путь историка. Избранные труды по источниковедению и историографии / С. О. Шмидт. – М. : Рос. гумм. ун-т, 1997. – 612 с.



**Касьяненко Ю.А.**


## ДОКУМЕНТЫ РОДА КОВАЛЕВСКИХ В АРХИВАХ УКРАИНЫ

Дворянский род Ковалевских известен в Украине и за ее пределами в связи с публичной деятельностью отдельных ее членов. Представители этой фамилии владели землями на территории современных Украины, Белоруссии, России, Польши. Со временем сформировались отдельные ветви этого рода: харьковская (слободско-украинская), черниговская, витебско-псковская (двинская линия), себежская и казанские линии [3, с. 49; 4, с. 29–31]. Из всех вышеперечисленных линий в архивных учреждениях Украины наиболее полно представлена документация харьковской старшинско-дворянской ветви рода Ковалевских.

Целью доклада выступает ознакомление с документальными источниками рода Ковалевских в архивах Украины.

В Центральном государственном историческом архиве Украины в городе Киеве (ЦГИАК) находится фамильный фонд Ковалевских. Фонд 1814 «Ковалевские – украинские помещики Змиевского уезда, Харьковской губернии» (1703–1906 гг.) насчитывает три описи. Каждая




Репозиторий ВГУ